уласнай традыцыйнай культуры, і антрапалагічныя фільмы тут – вельмі дзейсны і выніковы сродак.

1. Тоффлер, Э. Шок будущего / Э.Тоффлер / перевод на русский язык: А. Мирер, И. Москвина-Тарханова, В. Кулагина-Ярцева, Л. Бурмистрова, К. Бурмистров, Е. Комарова, А. Микиша, Е. Руднева, Н. Хмелик. — М.: Амфора, 2001. – 346 с.

## ПРАБЛЕМЫ ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАГА ЗАСВАЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСЕННАЙ ТРАДЫЦЫІ ЎДЗЕЛЬНІКАМІ КУРСАВЫХ ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

***Петухова Н.В.,*** *старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору, кандыдат педагагічных навук*

Даследаванне і прапаганда фальклору – найважнейшы спосаб спасціжэння скарбаў нацыянальнай культуры сучасным грамадствам. Для выканання гэтай пачэснай і складанай (ў наш глабалізаваны час) функцыі грамадства Беларусі забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў-беларусазнаўцаў для розных сфер сацыякультурнай дзейнасці. Але, перш чым пачаць даследаваць і прапагандаваць фальклор, яго трэба спачатку зафіксаваць падчас фальклорна-этнагарафічнай экспедыцыі. Экспедыцыя – адзін з галоўных сродкаў прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў кафедры этналогііі фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, сродак, які дазваляе паглыбіць і замацаваць атрыманыя на занятках тэарэтычныя веды і практычныя навыкі, пазнаёміць будучых фалькларыстаў-практыкаў з жывым бытаваннем фальклору, дапамагчы ім авалодаць першапачатковымі навыкамі збіральніцкай працы. Мы рыхтуем супрацоўнікаў устаноў культуры па спецыяльнасці «народная творчасць» з напрамкам «фальклор» [2], таму гэты этап іх адукацыі – вельмі істотны.

У буклеце, распрацаваным для абітурыентаў і іх бацькоў, якія цікавяцца прафесійнай падрыхтоўкай фалькларыстаў, пазначана: «Кафедральная мадэль падрыхтоўкі спецыяліста па фальклоры, якая забяспечвае захаванне ўзораў мастацтва вуснай традыцыі не мае аналагаў у іншых універсітэтах Беларусі. Палявая экспедыцыйная праца на першым курсе (вучэбная фальклорная практыка студэнтаў) з’яўляецца асновай кафедральнай дыдактычнай мадэлі падрыхтоўкі спецыялістаў па фальклоры:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| фальклорная экспедыцыя на I курсе | → | яе вынікі як дыдактычны матэрыял на II-III курсах | → | рэвіталізацыя матэрыялаў у якасці дыпломнага праекта і асновы дыпломнага даследавання на IV курсе |
|---|---|---|---|---|

У рэалізацыі такой мадэлі – сэнс навучання на кафедры і падрыхтоўкі захавальнікаў і пераемнікаў фальклору; менавіта за рэалізацыю такой мадэлі выступаюць шэраг вядучых спецыялістаў па фальклоры Ўсходняй Еўропы (З.Я. Мажэйка, І.У. Мацiеўскi, Т.Б. Варфаламеева, Г.В. Таўлай, В.М. Шарая, Р.М. Кавалёва) [1]». Акрэсленая вышэй мадэль падрыхтоўкі спецыялістаў-практыкаў па фальклоры была свядома пакладзена ў аснову базавага плана падрыхтоўкі па спецыяльнасці «народная творчасць» з напрамкам «фальклор», ля ідэі і распрацоўцы якога былі былы першы рэктар БДУКМ (як універсітэта) Я.Д.Грыгаровіч і першы дэкан факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва В.В.Калацэй.

Студэнты кафедры з вялікім энтузіязмам штогод адпраўляюцца ў фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі па Беларусі. Але найбольшы іх інтарэс выклікае адзін з самых маляўнічых і цікавых старажытных абрадаў Беларусі, які захаваўся да нашых дзён – гэта абрад ваджэння і пахавання «Стралы» (з 2001 па 2017 гады студэнты і выкладчыкі кафедры наведвалі вёскі Неглюбка, Стаўбун, Янóва, Пералёўкаі Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці, часа трапляючы ў 2-3 вёскі за адзін выезд). У працэсе арганізацыі экспедыцый кафедра імкнулася зацікавіць студэнтаў праблемай вывучэння, захавання і пераймання беларускай каранёвай культуры сродкамі святочных каляндарна-абрадавых традыцый, у прыватнасці лакальнай абраднасці Пасожжа.



Студэнты БДУКМ курсаў Н.Петуховай і Л.Рыжковай, выкладчыкі Н.Петухова і Н.Матыліцкая ў экспедыцыі на «Страле», Стаўбун, 2009



Павязванне неглюбскага плата студэнтцы Ю. Бондар, Неглюбка, 2009

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У студэнцкай экспедыцыйнай працы выкладчыкі-мастацкія кіраўнікі курсаў кафедры Т.А. Пладунова, В.В. Калацэй, Н.В. Петухова, Н.В.Матыліцкая, Э.В. Шчадрына вылучаюць тры найважнейшыя этапы. На фарміраванне этапаў і іх паслядоўнасць паўплывалі: метад «ўключанага назірання», вывучаемы на кафедры ў межах дысцыпліны «Культурная антрапалогія» (лектар – прафесар Э.К. Дарашэвіч); метад дэманстратыўнай антрапатэхнікі (выкарыстоўваецца ў выкладанні практычных кафедральных дысцыплін па парадзе этнографа Т.І. Кухаронак, этнамузыколага Т.Б.Варфаламеевай і этнахарэолага М.А. Козенкі); этнасеміятычны метад, вывучаемы ў межах дысцыпліны «Этнасеміётыка» (лектар – прафесар А.У. Рагуля).

На першым этапе задачай даследавання становіцца вывучэнне студэнтамі мясцовага выканальніцкага стылю, іх знаёмства з творчасцю аўтэнтычных выканаўцаў твораў народнага мастацтва (песень, танцаў, карагодаў, інструментальнай музыкі). Арганізуючы гэту работу, мы зыходзілі з даўно вядомых сведчанняў збіральнікаў фальклору аб тым, што паўнавартаснае ўздзеянне фальклорны твор аказвае толькі падчас яго «жывога» аўтэнтычнага выканання і непасрэднага ўспрымання ад носьбітаў. Незвычайная прыгажосць фальклорных твораў, узмоцненая натуральнасцю трансляцыі, усведамленне сваёй роднасці з тымі, хто некалі жыў і выконваў гэтыя творы, аказвае незабыўнае ўражанне на студэнтаў, адкрывае новыя эмоцыі, асацыяцыі, гарманічныя структуры, драматургічныя камбінацыіі г.д. Непасрэднае ўспрыманне «жывога» выканання паглыбляе жыццёвы і эстэтычны вопыт студэнтаў, садзейнічае павышэнню інтарэса да будучай прафесійнай дзейнасці і ўдасканаленню выканальніцкага майстэрства, абуджае жаданне берагчы і працягваць мастацкія традыцыі Беларусі.

На першым этапе экспедыцыйнай работы адбываецца збор і фіксацыя студэнтамі фальклорных матэрыялаў. Сабраныя фальклорныя матэрыялы павінны адпавядаць двум асноўным патрабаванням – быць асновай для навуковага даследавання музычнага фальклору, і быць прыдатнай базай для пераймання зафіксаванага фальклорнага ўзору. Вынікі фіксацыі звычайна захоўваюцца ў экспедыцыйнай справаздачы, якая можа ўтрымліваць не толькі пашпартныя дадзеныя і паэтычныя тэксты песенных твораў, але і іх нотныя запісы.

Вядома, што традыцыйная нотная фіксацыя музычнага фальклору валодае як добрымі якасцямі, так і недахопамі. Без яе былі б немагчымыя даследаванні такіх элементаў музычнай тканіны як лад, рытміка, шматгалосная фактура іінш. Аналіз нотных запісаў паслужыў асновай стварэння шматлікіх абагульняючых тэорый, якія адлюстроўваюць законы народнага музычнага мышлення. Праўда за межамі нотнага запісу застаюцца такія асаблівасці выканання песень,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як тэмбр і характар гучання, спосаб гуказдабывання і іншыя элементы. Аднак для фальклору гэтыя элементы вельмі важныя: нотны запіс не ахоплівае ўсе тонкасці народнага інтанавання ў нетэмперыраваных строях. Шматлікія ўдакладняючыя мікраальтерацыйныя абазначэнні, якія ўводзяцца рознымі фалькларыстамі, не ў поўнай меры адпавядаюць рэальнаму гучанню. Некаторыя гукі, якімі карыстаюцца фальклорныя спевакі зусім немагчыма адлюстраваць пра дапамозе натацыі. Зрэдку прымяняюцца спецыяльныя знакі, якія аднак прыходзіцца разгорнута каментаваць, каб апісаць тую з'яву, якую прыходзіцца кадзіраваць гэтым знакам. Рознага роду гартанныя выкрыкі, гарлавыя прыгукі і іншыя элементы «экзатычнай» музычнай прамовы, часам набліжаюцца да гукаў, якія ў еўрапейскай прафесійнай традыцыі не лічацца ўласна музычнымі і таму не маюць графічнага адлюстравання. Таму для вырашэння гэтай праблемы нотныя запісы твораў пажадана падмацоўваць арыгінальным гуказапісам.

Задачай даследавання другога этапу экспедыцыйнай работы з'яўляецца перайманне этнафанічных асаблівасцей абраду ваджэння і пахавання «Стралы». На дадзеным этапесабраны фальклорны матэрыял становіцца асновай для вакальна-харавой і інструментальнай практыкі студэнцкага курсавога калектыву. Пры гэтым вядучае месца тут адводзіцца не толькі развучванню і выкананню разнастайных жанраў фальклору, але і мясцовых традыцый іх увасаблення. Праблемы засваення дадзеных традыцый звязаныя з імкненнем увасобіць у выкананні найбольш характэрныя рысы, уласцівыя пэўнаму рэгіёну.

Па-першае, гэта ўсведамленне дыялектных асаблівасцей народнай песні не як скажэння беларускай літаратурнай мовы, а як крыніцы жывой гаворкі, якая з’яўляецца інтанацыйна базай для ўзнікнення меладычнага багацця. Слова, прамоўленае ў дыялектнай форме, з уласцівай яму інтанацыяй, становіцца асновай для фарміравання спеўнай пазіцыі.

Па-другое, гэта вывучэнне рэгіянальных музычна-стылявых заканамернасцей. Рэгіянальны характар маюць тэмбравыя характарыстыкі гуку, ладавыя асаблівасці, поліртмія музычнай тканіны, розныя спецыфічныя выканальніцкія прыёмы (вібрата, мелізмы, глісанда). Варыянты аднаго і таго ж напеву, запісаныя ў вёсках Неглюбка, Стаўбун, Пералёўкаі Казацкія Балсуны могуць даць уяўленне пра яго тыповыя заканамернасці, пры гэтым праслухоўванне і аналіз усіх магчымых варыянтаў узбагачае слыхавы досвед студэнтаў і дазваляе паспяхова выкарыстоўваць яго ў выкананні. Спалучаючы шматразовае слуханне этнаграфічнага выканання народнай песні са спробамі ўласнага капіравання, студэнты захоўваюць моўныя інтанацыі, інтуітыўна шукаюць свае варыянты ў адпаведнасці з канкрэтнай сітуацыяй, жыццёвым кантэкстам. Такі спосаб навучання народным спевам садзейнічае далучэнню студэнтаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да творчасці на аснове мясцовых традыцый, пашырае іх уяўленні аб народнай музычна-паэтычнай мове, дазваляе ім адчуць і ўвасобіць у сваім выкананні атмасферу бытавання фальклору, што спрыяе найбольшаму іх пагружэнню ў фальклорную культуру, узбагачае эмацыянальны свет, выхоўвае любоў да роднага краю.

На трэцім этапе задачай даследавання становіцца працэс аднаўлення і ўкаранення каляндарнага абраду ваджэння і пахавання«Стралы».У выкананні студэнцкага фальклорнага калектыву народная песня можа прагучаць больш або меньш натуральна падчас удзелу ў абрадавай сітуацыі. Таму студэнты кафедры штогод далучаюцца да абрадаў ваджэння і пахавання «Стралы» ў месцах іх жывога бытавання, у вёсках Стаўбун, Неглюбка, Казацкія Балсуны, Пералёўка Веткаўскага раёна. У выніку сумеснага музіцыравання з народнымі віртуознымі спявачкамі яны авалодваюць традыцыйнай манерай спеваў, удасканальваюць свае выканальніцкія навыкі, а таксама навыкі вар'іравання і імправізацыі. Пры гэтым адбываецца паглыбленне ўдзельнікаў калектыву ў сферу абраду, а іх выкананне атрымлівае эмацыянальную афарбоўку, што забяспечвае неабходны характар гучання. Шматлікія формы агульных шэсцяў, карагодаў, гульнявых дзеянняў, танцаў разлічаны на свабоднае далучэнне ўсіх жадаючых, што садзейнічае ўздыму грамадскага прэстыжу мясцовага фальклору і дазваляе зрабіць працу па адраджэнню песенных традыцый масавай этнакультурнай акцыяй.

Дыпломны праект выпускнікоў кафедры І.Глушэц і Я.Нікалаенкі як рэвіталізацыя «Стралы» ў Неглюбцы, 2010


З носьбітамі (злева – Л.Саломенная, у цэнтры – Г.Гаўрыленка)


Школьніцы з Неглюбкі


Хаванне «Стралы»


Вядуць «Стралу»


Травестыйныя «старцы»


Вядуць «Стралу», «старчыха» (П.Цалка) – справа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2010 годзе студэнты класа старшага выкладчыка Ларысы Мікалаеўны Рыжковай (Глушэц Ірына, Аляксеева Надзея, Абрамовіч Паліна, Клімашэўская Настасся, Шаблюк Марыяна, Нікалаенка Яніна), наведваўшыя папярэдне з фальклорнай экспедыцыяй Веткаўшчыну, зрабілі дыпломны праект па рэвіталізацыі ваджэння і пахавання «Стралы» ў Неглюбцы. Яны былі вельмі ўзрушаны і апантаны сваім дакрананнем да «жывой» традыцыі, якую папярэдне дасканальна вывучалі на занятках. Студэнты майго курса (Любанец Юлія, Сахарчук Юлія, Блоцкая Кацярына, Герасіменка Вольга, Ступенька Кацярына, Балоціна Таццяна, Краўчук Наталля), які не быў выпускным, таксама ім дапамагалі ў гэтым і бралі ўдзел у «Страле».

К 2010 году ў Неглюбцы даследчыкі канстатавалі затуханне традыцыі, пераход яе ў т.зв. «латэнтны» стан, калі форма і змест абрада існуе збольшага ў свядомасці носьбітаў, а не ў іх паводзіннай культуры. Таму мэта дыпломнага праекта (як і ў большасці такога кшталту праектаў кафедры) была не толькі даследаваць саму з'яву і знаёміць з ёй студэнтаў, але, паралельна, і ствараць заўважны прэцэдэнт рэвіталізацыі абрада, папулярызаваць яго і суполку яго аўтэнтычных носьбітаў, пазначыць шляхі пераемнасці абрада ў мясцовым асяродку. Дзякуючы апантанасці і энэргіі студэнтаў, супольнай працы прафесарска-выкладчыцкага склада кафедры, таленту і ведам неглюбскіх носьбітаў вынік быў даволі значны: да рэвіталізацыі былі далучаны мясцовая школа, гомельскае грамадскае аб'яднанне «Талака», носьбіты ўпершыню за некалькі год выйшлі на «Стралу» і атрымалі магчымасць праспяваць яе гуртом, да якога былі далучаны маладыя галасы, арыентаваныя на аўтэнтычныя спевы. Да таго ж бліскучая тэлежурналістка Алена Грыкень прысвяціла падзеі спецыяльны сюжэт у штодзённым тэлешоў «Добрай раніцы, Беларусь!» галоўнага тэлеканала «АНТ».

Удзел у рэвіталізацыі абрада (разам са студэнтамі спявалі сталыя носьбіты мясцовай традыцыі і дзяўчаты-школьніцы з Неглюбкі, далучаныя да пераймання) дазволіў аднавіць спецыфіку камунікацыйных актаў, асаблівасці ідэйна-эстэтычнай макрасферы традыцыйнага соцыуму падчас адрада. Спевакі і выканаўцы на народных інструментах, народныя майстры, узаемаадносіны паміж людзьмі ўтварылі спецыфічнае народна-творчае асроддзе, падчас якога пражыванне творчага акта студэнтамі суправаджалася станоўчымі эмоцыямі, падтрымкай з боку выкладчыкаў і народных выканаўцаў, што спрыяла творчай самарэалізацыі ўдзельнікаў студэнцкага спеўнага калектыву, станаўленнюсвабоднай і творча актыўнайасобы. Шэраг студэнтаў-удзельнікаў рэвіталізацыі паспяхова скончылі магістратуру ў НАН Беларусі, пішуць кандыдацкія даследаванні па мастацтвазнаўстве, некаторыя – з'яўляюцца лідэрамі і ўдзельнікамі музычных калектываў, арыентаваных на розныя формы засваення і папулярызацыі музыкі вуснай традыцыі Беларусі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Падводзячы вынікі, можна канстатаваць, што фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі, інтэграваныя ў навучальны працэс па беларусістыцы, ствараюць мэтанакіраваную сістэму далучэння студэнтаў да будучай прафесійнай дзейнасці ў галіне даследавання і захавання народнай культуры. Творчыя кантакты з народнымі выканаўцамі, вопыт сістэматызацыіі фіксацыі твораў мастацтва вуснай традыцыі, перайманне мясцовых прыёмаў і стыляў выканання фальклору метадам дэманстратыўнай антрапатэхнікі, іх гуртавое аднаўленне і ўкараненне ў сацыякультурную практыку ствараюць неабходны фундамент для цыклу спецыяльных беларусазнаўчых дысцыплін, разнастайных эўрыстычных задач як творчага, так і даследчага плана.

---

1.Кафедра этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў : буклет / укл. В.Калацэй, маст. афармл. В.Красулін. – Мінск : БДУКМ, 2017. – 2 с.

2.Постановление Министерства образования Республики Беларусь от 07.08.2008 №64 "Об утверждении и введении в действие образовательных стандартов по специальностям высшего образования первой ступени" (Текст правового акта с изменениями и дополнениями на 1 января 2014 года) [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу: http://pravo.newsby.org/belarus/postanov10/pst007/page14.htm. – Дата доступу: 02.06.2017.

## АКТЕРСКИЙ ТРЕНИНГ В РАЗВИТИИ ПРОФЕССИОНАЛЬНЫХ НАВЫКОВ УЧАСТНИКОВ ТЕАТРА-СТУДИИ «7 ПАВЕРХ»

***Пасютина З.М.,*** *профессор кафедры театрального творчества, доцент*

Профессия режиссёра, театрального педагога, предполагает не только эмоциональное напряжение, но и более высокие его уровни вплоть до эмоционального «накала», что роднит его с профессией актёра. Развитие профессиональных навыков посредством ежедневного актёрского тренинга считаем особо важным сегодня, так как он позволяет приобрести умения быстрого включения в творческий процесс, оставлять за стенами университета, театра всё ненужное для творчества.

Замечательный русский режиссёр и педагог Вл.И. Немирович-Данченко оставил стройное учение о творческой роли режиссёра. В своей книге «Из прошлого» он отмечает, что «режиссёр – существо трехликое: режиссёр-толкователь, он же показывающий, как играть, так что его можно назвать режиссером-актёром, режиссёром-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ